Учреждение образования Федерации профсоюзов Беларуси
«Международный институт трудовых и социальных отношений»

Витебский филиал

# ИСТОРИЯ ГЕРМАНИИ И ГЕРМАНСКИЙ ВОПРОС С ДРЕВНОСТИ ПО СОВРЕМЕННОСТЬ: ИСТОРИЧЕСКИЕ, ЭКОНОМИЧЕСКИЕ, СОЦИАЛЬНЫЕ, ПРАВОВЫЕ И ДУХОВНО-КУЛЬТУРНЫЕ АСПЕКТЫ

*Материалы международной научной конференции*

*8-9 октября 2009 г.*

Витебск 2009

## НАКІРУНКІ ПАЛІТЫКІ ГЕРМАНСКІХ ВАЙСКОВЫХ УЛАДАЎ НА АКУПІРАВАНЫХ БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (верасень 1915 - люты 1917 гг.).

*М.В.Цуба*
*(г.Пінск, УА "Палескі дзяржаўны універсітэт")*

Захопніцкія мэты Германіі падчас Першай сусветнай вайны ў значнай ступені закранаді і беларускія землі. Германія імкнулася не толькі разграміць Англію, Францыю, але ж і моцна паслабіць Расійскую імперыю адняўшы ў яе Беларусь, Украіну і Прыбалтыку. Напрыклад, ужо 6 жніўня 1914 года германскі канцлер Г. фон Бетман-Гольвег заявіў, што яго краіна жадае "вызваліць прыгнечаныя народы Расіі і адцясніць рускі імперыялізм да маскоўскіх межаў" [1, с.1]. Больш акрэслена ў гэтым накірунку выступіла нацыяналістычная арганізацыя Пангерманскі саюз. У праграме дадзенай арганізацыі, падрыхтаванай 28 жніўня 1914 года, пазначана аб неабходнасці аддзялення ад Расіі зямель Польшчы, Ліфляндыі, Курляндыі, Літвы, Беларусі і Украіны. Вядомы дзеяч Пангерманскага саюза, прафесар Ф. Лецiус прапанаваў перанесці граніцы Расіі ад Балтыйскага мора да межаў Волхава і Дняпра, а пагранічнымі гарадамі Германіі на усходзе зрабіць Вялікі Ноўгарад і Магілёў [1, с.1]. Аднак пераважная большасць нямецкіх палітыкаў, прадпрымальнікаў, ваенных і прадстаўнікоў інтэлігенцыі на пачатку вайны лічылі, што Германія павінна аддзяліць ад Расійскай імперыі польскія і прыбалтыйскія землі, а таксама "рускую Польшчу" (г. зн. заходнебеларускія землі). Гэтыя тэрыторыі меркавалася ператварыць у своеасаблівы буфер, які б абараняў усходнія землі рэйха ад магчымых нападкаў з боку расійскіх войск. Астатнія землі, якія магчыма будуць заваяваныя на Усходзе, па іх меркаванню, патрэбна было выкарыстаць у якасці "разменнай карты" падчас дыпламатычных перамоваў з Расіяй у выпадку згоды яе кіраўніцтва на заключэнне сепаратнага міру [1, с.2].

Восенню 1915 года Беларусь у выніку ваенных паражэнняў расійскай арміі была падзелена на дзве часткі: заходнюю (Гродзенская, большая частка Віленскай і частка Мінскай губерняў), акупіраваную германскімі войскамі, і ўсходнюю.

У занятай нямецкімі войскамі Вільні засталася невялікая група актыўных беларускіх нацыянальных дзеячаў на чале з братамі Іванам і Антонам Луцкевічамі, Алаізай Пашкевіч-Кайрыс (Цёткай), Вацлавам Ластоўскім і інш.. Менавіта яны ўвайшлі з беларускага боку ў так званы Віленска-Ковенскі

камітэт, створаны з прадстаўнікоў палякаў, літоўцаў, беларусаў і яўрэяў, якому адступіўшыя расійскія улады перадалі кіраванне горадам.

Арыентуючыся на Захад (цэнтральнаеўрапейскія краіны), дзеячы народных камітэтаў паставілі на мэце аднавіць незалежнае Вялікае Княства Літоўскае, а дакладней, "незалежнасць Літвы і Беларусі абыймаючы літоўскія і беларускія землі, злучаныя эканамічнымі варункамі і супольнымі палітычнымі жаданнямі" [2, арк.19].

Аднак ў планы германскага ўраду не ўваходзіла ні стварэнне незалежнай беларуска-літоўскай дзяржавы, ні тым больш федэрацыі Беларусі і Літвы з Польшчай. Кайзераўская Германія і сама была не супраць замацаваць сваю ўладу над захопленай тэрыторыяй. Да таго ж падзел на народныя камітэты быў даспадобы немцам, якія выкарыстоўвалі яго для сваіх мэт і праводзілі на захопленых землях двудушніцкую палітыку. Акаталічаным беларусам, якіх называлі палякамі, абяцалі адраджэнне Польшчы, а беларусам і літоўцам - разгледзець пытанне аб утварэнні іх дзяржавы. У адозве акупацыйных улад да жыхароў Вільні, падпісанай графам Пфайлем, гаварылася, што "нямецкія войскі шчыра спачуваюць польскаму насельніцтву" [3, с.264], а ў лісце да генерала Людэндорфа рэкамендавалася яму "каб вялося змаганне з польскімі ўплывамі і каб падтрымліваліся іншыя нацыянальнасці (літоўцы, беларусы, яўрэі)" [3, с.264]. Менавіта такая палітыка германскіх акупацыйных улад прывяла народныя камітэты да ўнутраных спрэчак у сувязі з невызначанасцю пытання па той частцы Беларусі, дзе пераважалі каталікі. Гэтая спрэчка ў рэшце рэшт скончылася распадам камітэта.

Разбурыўшы Віленска-Ковенскі камітэт, нямецкія ўлады ў сваю чаргу прынялі адпаведныя меры па прадухіленні паглынання Беларусі Польшчай. Паводле загаду галоўнакамандуючага германскім фронтам фельдмаршала фон Гіндэнбурга ад 16 студзеня 1916 года беларуская мова абвяшчалася раўнапраўнай з польскай, літоўскай і яўрэйскай, і мела правы ўжытку ў грамадскім, культурным, асветным, і адміністрацыйным жыцці [4, с.40].

У выніку з 15 студзеня 1916 г. пад рэдакцыяй Вацлава Ластоўскага ў Вільні двойчы на тыдзень стала выходзіць беларуская газета "Гоман".

Нямецкія акупацыйныя ўлады, якія далі дазвол на рэдагаванне газеты, у далейшым не перашкаджалі яе выданню, хаця "Гоман" актыўна выступаў за стварэнне незалежнай Беларускай рэспублікі або федэратыўнага "Беларуска-Літоўскага краю". "Гасударства, як форма бытавання народу, - пісаў "Гоман", - можа быць знішчана, разбіта, ды яно ў канцы канцоў адбудуецца нанава: калі толькі сам народ захаваў у сабе іскру жыцця, творчую сілу!" [5, с.2].

Лаяльнасць нямецкіх вайсковых улад да газеты можна растлумачыць тым, што Германія, хоць і была супраць стварэння незалежнай беларускай дзяржавы на захопленых ёй землях, усё ж не магла не заахвочваць тыя сілы, якія імкнуліся да паслаблення расійскага ўплыву ў дадзеным рэгіёне. Такая пазіцыя з боку германскіх улад давала пэўную свабоду дзейнасці беларускаму нацыянальнаму руху разам з газетай "Гоман".

Што датычыцца, увогуле, ролі германскага ўплыву на развіццё беларускага нацыянальнага руху на акупіраванай частцы Беларусі, то тут значнае месца некаторымі даследчыкамі адводзіцца асобе нямецкага падданага Эдмунда Зуземіля. Сам Э. Зуземіль лічыў сябе, не больш не менш, як "арганізатарам беларускага палітычнага руху ў сусветнай вайне" [6,с.1].

Аднак якіх-небудзь значных поспехаў ягоная дзейнасць у дадзеным накірунку не мела. Начальнік штаба Усходняга фронту генерал Э. Людэндорф у сваіх мемуарах увогуле аб Э. Зуземілі нідзе не ўспамінае[7].

Ні ў якім разе нельга перабольшваць ролю Э. Зуземіля і сярод беларускіх дзеячаў. Больш-менш прыязныя адносіны ў Э. Зуземіля існавалі толькі з В. Ластоўскім і то хутчэй усяго па доўгу, неабходнасці сумеснай працы на чале рэдкалегіі "Гомана". Браты Луцкевічы, Алаіза Пашкевіч (Цётка), Ю. Вітан-Дубейкаўская і іншыя беларускія дзеячы ўспрымалі Э. Зуземіля крайне негатыўна, называючы яго "палітычнай нянькай" з боку акупацыйных нямецкіх улад [8 с. 61].

У параўнанні Э. Зуземілем Ю. Вітан-Дубейкаўская даволі станоўча характарызуе нямецкага літаратара Вальтэра Егера, з якім разам працавала ў рэдакцыі газеты "Х-й арміі" (Zeitung der X Armee), дзе шмат друкавалася артыкулаў па геаграфіі, этнаграфіі і гісторыі беларускага краю. Яна піша: "Працуючы для газеты Х-й арміі, я супрацоўнічала з нямецкім літаратарам Вальтэрам Егерам (Waiter Jäger), які потым, у 1919 г. выдаў у Нямеччыне кнігу "Беларусь, яе землі й жыхары" (Weissruthenien sein Land and Bewohner) як рэзультат нашае супольнае працы ў газэце Х-й арміі" [94, с. 53]

Увогуле ж, вывучэнне фактычнага матэрыялу дае падставы сцвярджаць, што нямецкія ўлады, будучы не зацікаўленымі ні ў стварэнні незалежнай беларускай, ні беларуска-літоўскай дзяржавы, але і няздольныя германізаваць захопленую тэрыторыю, вымушаны былі даць выхад выбуховай нацыянальна-вызваленчай энергіі народаў, кантралюючы і накіроўваючы яе ў асноўным у нацыянальна-культурнае і асветнае рэчышча.

*Літаратура:*


1. www/cenunst.bsu.by/jounal/2002.4/tikhomirov.shtm
2. БДАМЛіМ. - Ф. - 3. Воп.1. - С.139.
3. Юхо, Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі: Вучэбны дапам. - Мінск: Універсітэцкае, 1992. - 270 с.
4. Калумбовіч, А. Крокі гісторыі: дасьледаванні, артыкулы, успаміны. - Беласток: Га Макс; Вільня: Наша ніва; Менск: Маст. літ., 1993. -288с.
5. Мялешка, І. Аснова быту //Гоман. -1916.-14 лістапада.
6. Зуземіль, Э. Мы і беларусы // Газета "ТаппепЬег§". - 1924. – 12 траўня.
7. Людэндорф, Э. Мон воспомннання о войне 1914-1918 гг. Москва- Минск, 2005.-231с.
8. Вітан-Дубейкаўская, Ю. Мае ўспаміны. - Вільня. - 1994. - 192 с.